Падтрымай "Вясну" на PATREON

На журналіста «Белсату» склалі пратакол за свіны гной

27.07.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Стас Івашкевіч.

Журналісту «Белсата» **Стасу Івашкевічу** прыйшла позва ў РАУС Ліды. Яго запрашаюць у кабінет да маёра міліцыі Івана Пыша, каб «азнаёміцца з матэрыяламі справы».

Па інфармацыі тэлеканала Белсат, у дачыненні да Івашкевіча склалі адміністратыўны пратакол паводле ч.2 артыкулу 229 КоАП за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ. Маецца на ўвазе сюжэт «Вёска ў Лідскім раёне тоне ў свіным гноі», які выйшаў у эфір праграмы «Аб'ектыў» 30 чэрвеня гэтага году.

Сюжэт быў прысвечаны кепскім экалагічным умовам на свінакомплексе ў вёсцы Дворышча каля Ліды. Жыхары вёскі самі звярнуліся да журналістаў з просьбай распавесці аб праблеме: у свінакомплексе не працуе належным чынам сістэма ачысткі адкідаў, а мясцовыя ўлады не спяшаюцца выпраўляць

сітуацыю.

> *«Мы выклікалі экалагічную праверку, яна прыехала ўжо на наступны дзень. Тады да нас выбег дырэктар свінакомплексу і сказаў, што зараз выкліча міліцыю. Я ўпэўнены, што пазней ён паглядзеў і сюжэт»,* – кажа Івашкевіч.

Журналіст адзначае, што збіраецца вярнуцца ў Дворышча, каб зняць працяг сюжэту і адсачыць змены пасля прыезду праверкі.

> *«Калі буду мець час, то зайду ў міліцыю, чаму не... Але канчатковае рашэнне прыму пасля кансультацыі з кіраўніцтвам і юрыстамі Беларускай асацыяцыяй журналістаў»,* – гаворыць ён.

Журналісты нашага тэлеканалу часцей за астатніх церпяць ціск з боку ўладаў, толькі з пачатку 2017 году пад адміністратыўны пераслед патрапіў дзясятак супрацоўнікаў «Белсату».

Твитнуть





Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў






#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля райда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY